# МЕТОДЫКА ПРАВЯДЗЕННЯ АНАЛІТЫЧНЫХ І СЛОВАЎТВАРАЛЬНЫХ ПРАКТЫКАВАННЯЎ ПРЫ ВЫВУЧЭННІ ТЭМЫ “СКЛАД СЛОВА”

Майбарадзіна Ганна Мікалаеўна
УА “Брэсцкі дзяржаўны ўніверсітэт імя А.С. Пушкіна”

У цяперашні час ні ў кога не выклікае сумнення неабходнасць вывучэння элементаў марфемікі ўжо ў пачатковых класах.

У сучаснай пачатковай школе ў курсе беларускай мовы вывучаюцца значымыя часткі словы – корань, прыстаўка, суфікс, канчатак. Дзеці распазнаваюць аднакаранёвыя словы і формы аднаго і таго ж слова, практыкуюцца ў напісанні слоў з галоснымі [о], [а], [э] і парнымі зычнымі ў корані, засвойваюць правапіс прыставак на [з], [с].

Спынімся на практыкаваннях, што вучаць вызначаць склад слова і ўтвараць новыя словы, папярэдне заўважыўшы, што сам раздзел “Словаўтварэнне” не дадзены ў традыцыйных падручніках для пачатковай школе ў дастатковым аб’ёме. Вучні разглядаюць адно толькі прыставачны і суфіксальны спосабы ўтварэння новых слоў.

Да ліку самых адказных і складаных пытанняў школьнай граматыкі адносіцца аналіз унутранай структуры слова, які ў школе называюць *разборам слова па складзе*. Правільны марфемны аналіз папярэджвае большасць арфаграфічных памылак, бо значкая доля арфаграфічных правілаў грунтуецца на марфалагічным прынцыпе (агульныя для роднасных слоў марфемы перадаюцца пры пісьме аднолькава). Без усведамлення ролі кожнай значымай часткі, без яе выдзялення нельга зразумець сэнс слова, нельга засвоіць правапіс галосных у корані і прыстаўцы, канчатках, суфіксах, нельга свядома вывучыць часціны мовы.

Практычныя назіранні і даследаванні паказваюць, што чым хутчэй, больш упэўнена і правільна вучні аналізуюць склад слова, тым вышэй іх арфаграфічная пільнасць. Калі вучні будуць свабодна арыентавацца ў структуры слова, навучацца вылучаць марфемы, што паўтараюцца ў дзесятках і сотнях слоў, яны гэтыя словы будуць пісаць правільна.

Пастаянныя практыкаванні ў разборы слоў па складзе важныя і ў другім сэнсе. Калі вучань вылучае марфемы, вызначаючы іх значэнне, перад ім абавязкова паўстае задача перабраць мноства слоў у пошуках роднасных, задумацца над іх сэнсам. Важна толькі, каб, ілюструючы магчымасці словаўтварэння, вучні не задавальняліся трыма-чатырма прыкладамі.Такая праца здольна зацікавіць дзяцей, дае магчымасць зразумець сам працэс утварэння слоў, высветліць іх этымалогію. Пры вывучэнні тэмы неабходна звяртаць увагу на словаўжыванне (выкарыстанне слова з той ці іншай

прыстаўкай, суфіксам у залежнасці ад сэнсу). Тым самым узбагачаецца слоўнік, развіваецца маўленне і пашыраецца агульны кругагляд вучня.

Аналіз вытворнай лексікі, назіранні за працэсам утварэння слоў роднай мовы, асаблівасцямі ўжывання вытворных слоў з улікам іх значэння і стылістычнай афарбоўкі – усё гэта развівае ўвагу вучняў, дазваляе глыбей разабрацца ў лексічным значэнні слова, спрыяе больш свядомаму засваенню моўных заканамернасцяў.

Такім чынам, вывучэнне марфемнай структуры слоў мае выключна важнае значэнне як у развіцці лінгвістычных здольнасцяў дзяцей, так і ў іх агульным развіцці.